# СТЫПЕНДЫЯЛЬНАЯ ПРАГРАМА
# УРАДА РЭСПУБЛІКІ ПОЛЬШЧЫ
# імя КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА
## ПАД ПАТРАНАТАМ ПРЭМ'ЕР–МІНІСТРА ПОЛЬШЧЫ
# ДЛЯ 300 СТУДЭНТАЎ З БЕЛАРУСІ

Праграма заснаваная на "Лісце аб намерах", падпісаным 30 сакавіка 2006 года ў залі імя Адама Міцкевіча Варшаўскага Універсітэта Прэм'ер-міністрам Польшчы спадаром Казімірам Марцінкевічам і спадаром Аляксандрам Мілінкевічам, кандыдытам у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, лідэрам Блоку аб'яднаных дэмакратычных сіл Беларусі, а таксама прадстаўнікамі Канферэнцыі рэктараў польскіх ВНУ (КРПВНУ) і Канферэнцыі рэктараў польскіх універсітэтаў (КРПУ), у прысутнасці некалькіх сотняў студэнтаў, навуковых супрацоўнікаў і гасцей цэрэмоніі.

Бакі засведчылі:

> *З улікам апошніх падзеяў у Беларусі, асабліва рэпрэсій, якія закранаюць маладых людзей, што бяруць удзел у абароне правоў чалавека і дэмакратыі, памятаючы нядаўнія часы, калі палякі таксама змагаліся за дэмакратыю і свабоду, польскі ўрад і Канферэнцыя рэктараў польскіх ВНУ дэкларуюць намер заснавання "Стыпендыяльнай праграмы імя Кастуся Каліноўскага". Праграма разлічана на 300 студэнтаў з Беларусі, якія з прычыны свайго ўдзелу ў справе абароны дэмакратычных каштоўнасцяў былі выключаны з вышэйшых навучальных установаў Рэспублікі Беларусь.*


KOORDYNATOR PROGRAMU

STUDIUM EUROPY WSCHODNIEJ — UNIWERSYTET WARSZAWSKI

BIURO PROGRAMU:

Pałac Potockich, Krakowskie Przedmieście 26/28, 00-927 Warszawa

Tel. +48-22 55 21 888; fax +48-22 55 21 887; e-mail: bialorus.studium@uw.edu.pl; www.studium.uw.edu.pl

## I. УМОВЫ ПРАГРАМЫ

1. Створанаму стыпендыяльнаму фонду надаецца імя выбітнага дзеяча беларускай культуры і нацыянальнага адраджэння Кастуся Каліноўскага (нар. у 1838 годзе), удзельніка нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863 года, старшыні Літоўскага Правінцыянальнага Камітэту ў Вільні, закатаванага ў 1864 годзе, памяць якога беларусы ўшаноўваюць да сённяшняга дня.
2. Праграма мае на мэце даць шанец студэнтам з Беларусі, пазбаўленным магчымасці навучацца ў ВНУ з-за палітычных поглядаў, атрымаць вышэйшую адукацыю ў Польшчы альбо навучацца да таго моманту, пакуль яны не змогуць вярнуцца ў свае навучальныя ўстановы.
3. Польскі ўрад абавязаўся вылучыць адпаведныя сродкі на стыпендыі студэнтам з Беларусі, а польскія навульныя ўстановы, аб'яднаныя ў Канферэнцыю рэктараў польскіх ВНУ і Канферэнцыю рэктараў польскіх універсітэтаў, забяспечыць навукова-дыдактычныя ўмовы навучання.
4. Праграма рэалізуецца ў супрацоўніцтве з Міністэрствам замежных спраў і Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Польшча.
5. На базе Варшаўскага універсітэта ўтвараецца Бюро Праграмы, заданнем якога будзе падрыхтоўка дакументацыі кандыдатаў на атрыманне стыпендыі, апрацоўка заяваў навучальных установаў, якія ўдзельнічаюць у праграме, арганізацыя трохмесячнага падрыхтоўчага курса ў летні перыяд, а таксама каардынацыя прытанняў размеркавання стыпендыстаў у польскія навучальныя ўстановы.
6. Дырэктарам Стыпендыяльнай праграмы імя Кастуся Каліноўскага, які каардынуе працу Бюро і Кваліфікацыйнай камісіі, будзе з'яўляцца дырэктар Студыюма Ўсходняй Еўропы Варшаўскага універсітэта.

## II. КАНДЫДАТЫ

1. Кандыдатамі Праграмы могуць выступаць студэнты, выключаныя з навучальных установаў з палітычных прычынаў.
2. Веданне польскай мовы неабавязкова.
3. Кваліфікацыя кандыдатаў, у межах працы Бюро, будзе ажыццяўляцца Камісіяй, створанай для гэтых мэтаў Каардынатарам праграмы, згодна з умовамі "Ліста аб намерах".
4. Размеркаванне студэнтаў у адпаведныя навучальныя ўстановы Польшчы будзе ажыццяўляць Бюро Праграмы, згодна з заявамі навучальных установаў і з улікам магчымасці працягу вучобы, распачатай студэнтамі ў Беларусі.
5. Камісія альбо асоба, прызначаная рэктарам універсітэту, куды накіруюць студэнтаў, у межах адпаведных факультэтаў правядзе ацэнку акадэмічнай розніцы ў навучальных праграмах і акрэсліць спосаб яе ліквідацыі.

## III. ПАДРЫХТОЎЧЫ КУРС

Трохмесячны падрыхтоўчы курс (VII-IX 2006 г.) складаецца з:

1. інтэнсіўнага вывучэння польскай мовы (да 5 гадзін у дзень).
2. дадатковага вывучэння ангельскай мовы (паводле ўзроўня валодання).
3. заняткаў па інфарматыцы, карыстанню кампутарнымі праграмамі і працы з Інтэрнэт-рэсурсамі.
4. лекцый і семінараў па гісторыі і культуры Польшчы.
5. лекцый і семінараў па гісторыі і культуры Беларусі, Літвы, Украіны, а таксама Цэнтральнай і Ўсходняй Еўропы.
6. лекцый і семінараў па сучасных міжнародных праблемах, з асаблівым націскам на тэматыку Еўрапейскага Звязу.
7. шырокай культурнай праграмы, сустрэч і дыскусій.
8. краязнаўчых экскурсій і навуковых аб'ездаў па Польшчы.

## IV. УМОВЫ СТЫПЕНДЫІ

1. Тэрмін вучобы будзе вызначацца ў залежнасці ад таго, на які курс будзе залічаны студэнт (пры залічэнні на першы курс вучоба можа працягвацца 5 гадоў).
2. Студэнты будуць вызвалены ад аплатаў за навучанне ў вышэйшых навучальных установах Польшчы.
3. Студэнты будуць атрымоўваць на асабістыя выдаткі стыпендыю ў памеры 1240 злотых у месяц.
4. Студэнты атрымаюць аднаразовую дадатковую грашовую дапамогу ў памеры 400 злотых.
5. ВНУ забяспечаць стыпендыстаў месцамі ў студэнцкіх інтэрнатах.
6. Напачатку курса студэнты атрымаюць кнігі навукова-метадычнага характара: слоўнікі, энцыклапедыі, гістарычная і культуразнаўчая літаратура, а таксама напрыканцы курса спецыялізаваную літаратуру адпаведна абранай спецыяльнасці.
7. Напрацягу першага семестра кожнаму студэнту ў яго ўстанове будзе прызначаны апякун з ліку маладых навуковых супрацоўнікаў, які будзе дапамагаць у першы перыяд вучобы і адаптацыі.
8. Падчас знаходжання ў Польшчы студэнты будуць мець магчымасць арганізоўваць агульныя сустрэчы і канферэнцыі, развіваць адносіны з зацікаўленымі польскімі і міжнароднымі коламі, а таксама падтрымліваць кантакты з сябрамі ў Беларусі.

## V. ДАКУМЕНТЫ

1. Запоўненая анкета “Кандыдата Праграмы”.
2. Просьба аб прыняцці на вучобу (кшталту „ліст аб матывацыі”).
3. Залікоўка з былой навучальнай установы да моманту адлічэння.
4. Акадэмічная даведка (спіс здадзеных прадметаў).
5. Па магчымасці, праграмы прадметаў, якія выкладаліся ў Беларусі, для вызначэння розніцы ў пройдзеных курсах.
6. Па магчымасці, дакумент аб выключэнні з навучальнай установы.
7. Па магчымасці, дакумент аб арышце альбо прысудзе.

## VI. ПАДАННЕ ДАКУМЕНТАЎ

1. Кандыдат можа выслаць дакументы поштай, электронай поштай альбо факсам ці асабіста прынесці ў Бюро Праграмы ў Студыуме Ўсходняй Еўропы Варшаўскага універсітэта, ці ў бліжэйшае дыпламатычнае прадстаўніцтва РП у Беларусі, Літве ці Ўкраіне.
2. Інфармацыйныя буклеты і анкеты будуць даступныя ў Бюро Праграмы, на інтэрнэт-старонцы, а таксама ў дыпламатычных прадстаўніцтвах РП у Беларусі, Літве і Ўкраіне.
3. Тэрмін падачы дакументаў завяршаецца **20 чэрвеня 2006 г.**
4. Да **25 чэрвеня 2006 г.** адпаведная Камісія прыме рашэнне аб прыняцці кандыдатаў на Падрыхтоўчы курс "Стыпендыяльнай праграмы імя Кастуся Каліноўскага".
5. У выключных абгрунтаваных выпадках, кандыдаты змогуць падаць дакументы пазней.

## VII. БЮРО ПРАГРАМЫ

1. Бюро Стыпендыяльнай праграмы імя Кастуся Каліноўскага будзе знаходзіцца ў Варшаўскім універсітэце пры Студыюме Ўсходняй Еўропы, вул. Кракаўскае Прадмесце 26/28, палац Патоцкіх-Тышкевічаў, уваход Ц з дзядзінца палаца (Studium Europy Wschodniej UW, ul. Krakowskie Przedmieście 26/28, Pałac Potockich-Tyszkiewiczów, wejście C z dziedzińca Pałacu).
2. Бюро Праграмы пачынае працу ў панядзелак, **8 траўня 2006 г.**, а 12 гадзіне. **Tel.: 022 55 21 888, faks: 022 55 21 887, e-mail: bialorus.studium@uw.edu.pl** (з-за мяжы званіць: +48-22 55 21 888, з Польшчы: 022 55 21 888).


KOORDYNATOR PROGRAMU

STUDIUM EUROPY WSCHODNIEJ — UNIWERSYTET WARSZAWSKI

BIURO PROGRAMU:

Pałac Potockich, Krakowskie Przedmieście 26/28, 00-927 Warszawa

Tel. +48-22 55 21 888; fax +48-22 55 21 887; e-mail: bialorus.studium@uw.edu.pl; www.studium.uw.edu.pl